**Маўленчая размінка.** Прачытайце верш. Выразна вымаўляйце гукі [г], [р], [ч], [ў] і [ц’].

## Пралеска



Прыгрэла сонейка.
На ўзлеску
Птушыны спеў
Чуваць здаля...
Стаіць і слухае пралеска,
Як ціха дыхае зямля.
*Авяр’ян Дзеружынскі.*



***Зіхо́тны, зіхатлі́вы*** — які блішчыць, ззяе яркім, пераліві́стым святлом.
***Гамана́ (разм.)*** — бязладны шум ад мноства галасоў, гукаў.
***Шы́біна*** — тое, што і шы́ба.

### МІКОЛА МЯТЛІЦКІ

## Пытанні

Спытала Ганулька ў кветак і траў:
— Скажыце, хто луг так прыгожа прыбраў?
Гаворыць дзяўчынцы вятроў гамана:
— Лугамі хадзіла Красуня-Вясна!

Спытала Ганулька ў шумных палёў:
— Хто фарбы такое пяшчоты знайшоў?



Правообладатель Национальный институт образования

І чуе ў адказ зноў такое яна:
— Палямі хадзіла Красуня-Вясна!

Спытала Ганулька ў зіхотнай ракі:
— Сінечу на хвалі праліў хто такі?
Ёй шэпча ў адказ лёгкіх хваль гамана:
— Хадзіла ўзбярэжжам Красуня-Вясна!

А сонечны зайчык на шыбіну — скок.
Кульнуўся свавольна ён, слепячы зрок.
І жмурыцца Ганна:
— Ды гэта ж яна,
Смяецца і скача, Красуня-Вясна!

1. У каго цікавілася Ганулька пра вясновую прыгажосць? Пералічыце дзейных асоб у вершы.
2. Што чула дзяўчынка ў адказ на сваё запытанне?
3. Патлумачце сэнс радка «А сонечны зайчык на шыбіну — скок».
4. Як характарызуе саму Ганульку яе размова з кветкамі, травамі, вятрамі, палямі, ракой?
5. Дзякуючы каму дзяўчынка здагадалася пра надыход вясны? Чаму менавіта сонечны зайчык паслужыў ёй падказкай?
6. Чым верш Міколы Мятліцкага «Пытанні» падобны да народнай песні?
7. Які настрой стварае гэты твор? Прачытайце верш выразна, перадаючы вясенні настрой паэта.



Правообладатель Национальный институт образования

**8.** Разгледзьце рэпрадукцыю карціны Генрыха Вейсенгофа «Вясна».



Якія пытанні Ганульцы можна задаць да гэтага твора жывапісу? Прачытайце іх.



Размяркуйце ролі ў вершы. Прачытайце яго па ролях.

## ПРАВЕРЦЕ СЯБЕ

### *Ведаю...*

1. У якіх творах даецца такое апісанне вясновай прыроды?

а) Зазвіняць жалобна крыгі,
І бурлівая вада
Снег, размоклы ў час адлігі,
Змые з лугу без следа;



Правообладатель Национальный институт образования

б) «Пачарнеў на полі снег, а на ўзгорках сталі паказвацца чорныя лапінкі, лысіны. Па вуліцах пацяклі равочкі каламутнай вады. Весела бягуць яны разоркаю з поля праз двор, блішчаць і срэбрам пераліваюцца на сонейку. Цякуць яны і ўсё большаюць».

2. Да якіх твораў зроблены гэтыя малюнкі? Назавіце аўтараў гэтых твораў.





3. Адгадайце, пра каго ці пра што гаворыцца ў наступных радках.

а) Вось і ...
Нарэшце прыляцелі,
Дружна
На галінках дрэў
Паселі,

Птушак слухаюць,
Паветра п'юць
І, здаецца,
Зараз запяюць;



Правообладатель Национальный институт образования

б) «Сустрэнуцца, забулькаюць нешта вясёленькае адзін аднаму, сальюцца і пабягуць далей разам. Іх сустрэне зноў новы равок, а там, пазіраеш, прыстане і чацвёрты, і пяты. І ўсе яны зліваюцца: разам і весялей, і лягчэй ваяваць з тымі парогамі, якія загараджаюць ім дарогу».

***Разумею, магу растлумачыць...***

1. Чаму людзям падабаецца вясна?
2. Якія вершы і апавяданні з гэтага раздзела спадабаліся вам? Чаму?
3. З якой мэтай пісьменнікі ў сваіх творах ужываюць вобразныя словы і выразы?
4. Устаўце прапушчаныя словы ў паэтычныя радкі:

а) Спытала Ганулька ў кветак і траў:
— Скажыце, хто луг так прыгожа ...?
Гаворыць дзяўчынцы вятроў гамана:
— Лугамі хадзіла ... ...!

б) Раненька,
На зорцы, на ...
Прыляцелі
Цёплыя ... .
Сонца на блакіт ...
Прынеслі —
Зазвінелі ...,
Як песні.



Правообладатель Национальный институт образования

5. Разгледзьце малюнкі. Складзіце апавяданне. Дайце яму загаловак.









*Апорныя словазлучэнні і сказы:* з боку лесу, на адной з крыг, спалоханае медзведзяня, Максімка не разгубіўся, бацька чысціў ад снегу сцяжынку, было небяспечна, хуткае цячэнне, лодку кідала ў розныя бакі́, зачапіў багром, пасадзіў малое ў лодку, на супрацьлеглы бераг, высадзіў медзведзяня, аблізвала языком, як бы дзякавала чалавеку, Максімка ганарыўся сваім татам.

6. Чаму Максімка ганарыўся сваім бацькам? Выкажыце свае думкі.



Правообладатель Национальный институт образования